# ОТ РЕДАКЦИИ
# АД РЭДАКЦЫІ
# EDITORIAL

На 1 студзеня 1919 г. прыпадае адна з найбольш важных юбілейных дат у станаўленні беларускай дзяржаўнасці – стагадовы юбілей абвяшчэння БССР.

У навуковым дыскурсе адносна абвяшчэння рэспублікі і развіцця яе на розных этапах існавання застаецца шмат нераспрацаваных і складаных пытанняў, якія выклікаюць рознасць у ацэнках, поглядах і нават спрэчкі сярод даследчыкаў. Гэта часта абумоўлена не толькі адсутнасцю крыніц па спрэчных пытаннях, але таксама і асабістымі, нярэдка ідэйнымі перакананнямі. Некаторым навукоўцам абвяшчэнне БССР уяўляецца спробай бальшавікоў вырашыць нацыянальнае пытанне на сваю карысць, другім – геапалітычным манеўрам бальшавікоў, трэцім – непрадказальным і выпадковым збегам абставін, чацвёртым – заканамерным вынікам гістарычнага працэсу. Як бы там ні было, спрачацца з тым, што 1 студзеня 1919 г. – адна з найбольш важных дат у гісторыі станаўлення беларускай дзяржаўнасці, немагчыма: эвалюцыя беларускіх органаў улады, прававой сістэмы, сістэмы адукацыі, сучасных граніц, цяперашняя сталіца, у значнай ступені сфарміраваная сістэма каштоўнасцей і ўяўленняў беларусаў сёння – усё гэта спадчына, якая засталася нам ад БССР, спадчына, якая сфарміравала нас сённяшніх.

Канешне, у стварэнні БССР прысутнічала пэўная дыхатамія, пэўны кампраміс паміж тэндэнцыямі разгортвання гістарычных працэсаў аддаленай ад нас ужо стагоддзем эпохі. З аднаго боку, стварэнне рэспублікі стала відавочным вынікам развіцця беларускага руху, які, нягледзячы на перашкоды, галасна пра сябе заявіў. Тое, што беларускі этнас ужо тады пераўтварыўся ў паўнавартасную нацыю, стварыла важнейшую з передумоў для фарміравання новай беларускай дзяржаўнасці. З іншага боку, Першая сусветная вайна і народжаныя ёй Лютаўская і Кастрычніцкая рэвалюцыі абумовілі тыя абставіны, тыя палітычныя і геапалітычныя передумовы, без якіх было б немагчымым вырашэнне пытання беларускай дзяржаўнасці. З улікам усіх гэтых передумоў абвяшчэнне БССР бачыцца заканамерным гістарычным вынікам. Няўдача абвешчанай у сакавіку 1918 г. БНР дазваляе ў гэтым пераканацца.

Варта адначасова памятаць, што стварэнне БССР было б немагчымым без той надзвычай важнай працы «абуджальнікаў» беларускага руху, якія жылі і працавалі яшчэ ў XIX ст., – беларускіх мысліцеляў, публіцыстаў, літаратараў, што закладалі фундамент будучага беларускага дома (Ф. Багушэвіч, В. Дунін-Марцінкевіч, гоманаўцы, многія іншыя інтэлектуалы). Яны сваёй працай адкрывалі народу дзверы ўласнага нацыянальнага быту. Варта не забываць і пра стваральнікаў першых беларускіх палітычных арганізацый, заснавальнікаў і аўтараў беларускіх газет і часопісаў, удзельнікаў Першага Усебеларускага з’езда, айцоў БНР, актыўная дзейнасць і самаадданая праца якіх сталі важнымі фактарамі стварэння ў будучым таксама і беларускай савецкай дзяржаўнасці. Каб ацаніць важнасць абвяшчэння БССР для беларускай дзяржаўнасці, успомнім хаця б тое, колькі было зроблена для Беларусі ў 1920-я гг., з якім энтузіязмам і запалам працавалі на карысць маладой рэспублікі паэты, мастакі, пісьменнікі, вучоныя, многія дзяржаўныя дзеячы маладой краіны. Надзвычайную важнасць тых падзей, якія юрыдычна аформіліся актам 1 студзеня 1919 г., падкрэсліла ўжо сама гісторыя фактам існавання сучаснай незалежнай Рэспублікі Беларусь.

Аўтары артыкулаў, якія змешчаны ў нумары часопіса, звярнуліся да некаторых навуковых пытанняў, звязаных з гісторыяй станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці. У матэрыяле В. В. Даніловіча разгледжаны працэс удзелу моладзі ў нацыянальна-культурным будаўніцтве Савецкай Беларусі ў міжваенны перыяд. Аўтар вызначае этапы і характэрныя асаблівасці развіцця

гэтага працэсу, падкрэсліваючы, што з сярэдзіны 1920-х гг. назіралася актывізацыя ўдзелу ў нацыянальна-культурным жыцці БССР як беларускіх юнакоў і дзяўчат, так і моладзі нацыянальных меншасцей. Удзел жа камсамольскіх структур у нацыянальна-культурным будаўніцтве фактычна да канца 1930-х гг. разгортваўся з цяжкасцямі: непрацяглыя ўздымы змяняліся спадамі. Толькі напрыканцы разглядаемага перыяду паглыбілася праца па выхаванні маладога пакалення ў духу інтэрнацыяналізму.

У фокусе артыкула С. М. Ходзіна – уяўленні беларусаў аб справядлівасці і пытанне аб тым, у якой ступені беларускай савецкай дзяржавай былі ўлічаны асаблівасці і традыцыі, што назапашваліся стагоддзямі і характарызавалі беларускую нацыю ў папярэдні перыяд. На думку даследчыка, базісным элементам разумення справядлівасці ў беларускага сялянства з’яўлялася праца. Праз адносіны да яе вызначаліся разуменне ўласнасці, і перш за ўсё – уласнасці на зямлю, сацыяльны статус чалавека. Прынцып працы, які зацвердзіўся ў ментальнасці беларусаў як выяўленне справядлівасці, трансліраваўся і на новыя формы гаспадарання. Менавіта гэта прадвызначыла параўнальна высокія вынікі працы сельскагаспадарчых калектываў БССР на працягу другой паловы 1930-х гг.

Розныя формы агітацыйна-прапагандысцкай работы партызанскіх і падпольных арганізацый сярод насельніцтва ў гады Вялікай Айчыннай вайны на акупаванай тэрыторыі Беларусі аналізуе А. А. Каваленя. Даследчык разглядае дзейнасць партыйных і дзяржаўных органаў па разгортванні адпаведнай ідэйна-палітычнай працы, якая не толькі спрыяла ўмацаванню маральна-валявога духу людзей, але і падтрымлівала іх грамадзянскія якасці, перашкаджала пранікненню ў грамадскую свядомасць паражэнчых настрояў і апатыі, узмацняла стойкасць народа ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.